View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE

# Гісторыя

**Рашэннем Вучонага савета БДУ ад 6 кастрычніка 2008 г. прэмія імя У.І. Пічэты ў галіне сацыяльных і гуманітарных навук была прысуджана доктару гістарычных навук, прафесару кафедры міжнародных адносін *У.Е. Снапкоўскаму* за цыкл вучэбных і навуковых прац па гісторыі знешняй палітыкі Беларусі.**

**Рэдкалегія часопіса, сардэчна віншуючы *У.Е. Снапкоўскага* з высокай узнагародай, прапанавала лаўрэату прадставіць на старонках выдання некаторыя з апошніх вынікаў сваёй навуковай дзейнасці.**

*У.Е. СНАПКОЎСКІ*

## АБ ПРАГЕРМАНСКАЙ АРЫЕНТАЦЫІ ЛІДЭРАЎ БЕЛАРУСКАЙ ПАЛІТЫЧНАЙ ЭМІГРАЦЫІ Ў ПРАЗЕ (1938–1941)

Рассматриваются послания председателя Рады БНР В. Захарки А. Гитлеру (апрель 1939 г.) и немецкому правительству (февраль и декабрь 1940 г.), которые отражали надежды прогермански настроенных лидеров белорусской эмиграции в Праге на восстановление белорусской государственности с помощью Германии и ее поддержку белорусской эмиграции в Европе.

Messages of the Chairman of the Council of the Belarusian Democratic Republic Wasil Zacharka to A. Hitler (April 1939) and the German Government (February and December 1940) are considered in the article. These documents reflected the hopes of progerman leaders of the Belarusian political emigration in Prague on restoration of the Belarusian statehood with the help of Germany and its maintenance in resolving particular tasks of the Belarusian emigration in Europe.

Напярэдадні Другой сусветнай вайны частка дзеячаў беларускай эміграцыі, што гуртаваліся ў Празе, выбрала прагерманскую арыентацыю з надзеяй на падтрымку Берліна ў вырашэнні беларускага пытання. Галоўным дзеячам беларускага асяродка ў Празе быў Іван Ермачэнка, які пераехаў сюды ў 1922 г., атрымаў тут медыцынскую адукацыю і займаўся лекарскай практыкай і палітычнай дзейнасцю сярод беларускай эміграцыі. З 1938 г. ён стаў выразным прыхільнікам беларуска-нямецкага супрацоўніцтва, да якога прыцягнуў старшыню Рады БНР Васіля Захарку, сімвалічнага лідэра БНР у эміграцыі, які жыў у Празе з сярэдзіны 1920-х гг., спадзеючыся такім чынам надаць сваім пачынанням характар гістарычнай пераемнасці[1].

У другой палове 1938 г. І. Ермачэнка і В. Захарка, карыстаючыся падтрымкай шэфрэдактара нямецкага прэс-бюро ў Празе К. Анзорге, які праяўляў цікавасць да беларускага пытання, апублікавалі ў чэшскай і нямецкай прэсе шэраг артыкулаў аб Беларусі і яе гаспадарчых і палітычных магчымасцях, што выклікалі, паводле слоў В. Захаркі, інтарэс «як чэскіх, так і нямецкіх адпаведных чыннікаў»[2].

У снежні 1938 г. у Празе быў створаны ініцыятыўны Беларускі камітэт, які актывізаваў працу беларусаў у Чэхаславакіі. Гэты камітэт, у склад якога першапачаткова ўвайшлі больш дзесяці чалавек, разаслаў заклік да ўсіх беларусаў, што жылі ў Празе і іншых гарадах Чэхаславакіі. «Гістарычныя падзеі, – гаварылася ў гэтым закліку, – паставілі і нашае беларускае пытаньне ў парадак дня. Хутка можа настаць момант, калі гэтыя падзеі пачнуць крышталізавацца ў кірунку адраджэньня нашае бацькаўшчыны. Але каб яны пайшлі ў пажаданым для нас кірунку, мусім памятаць, што гэта будзе ўва многім залежыць ад нас саміх. Дзеля гэтага мусім да гэтых падзеяў добра падрыхтавацца, а перад усім добра арганізавацца»[3].

26 снежня 1938 г. ініцыятыўны камітэт склікаў у Празе агульны сход беларусаў Чэ-

хаславакіі. На ім прысутнічала каля 20 чалавек, у тым ліку В. Захарка, І. Ермачэнка, П. Бакач, М. Крачэўскі, В. Русак, І. Аўчыннікаў, В. Хмара, Д. Вітушка, Л. Сахарчук, А. Жук. Былі абмеркаваны пытанні, звязаныя з тагачаснай сітуацыяй у Еўропе і задачамі, якія паўсталі ў сувязі з гэтым перад беларусамі, разгледжана «магчымасць супрацоўніцтва з нямецкім народам». Сход адкрыў В. Захарка, ён зрабіў інфармацыю аб тагачасных падзеях і акрэсліў шляхі, якімі павінны ісці беларусы. З прывітальным словам выступіў прадстаўнік украінскай дыяспары А.Г. Макарэнка. Там жа быў праведзены збор сродкаў на мэты беларускай нацыянальнай справы[4].

Як адзначаў В. Захарка, у той час беларусы вялікія надзеі ўскладалі на Германію і нямецкі народ, які яшчэ ў Першую сусветную вайну, па словах фельдмаршала П. Гіндэнбурга, прызнаў гістарычныя правы беларускага народа на яго вольнае жыццё, развіццё беларускай культуры, мовы, на яе раўнапраўнасць з мовамі іншых народаў. Беларусы, са свайго боку, выказвалі салідарнасць з нямецкім народам, прыніжаным Версальскім трактатам[5].

Пасля заняцця Чэхіі нямецкімі войскамі В. Захарка накіраваў нямецкаму канцлеру А. Гітлеру 20 красавіка 1939 г.[*] мемарандум (мемарыял) з просьбай прыняць пад увагу беларускае пытанне ў планаваным разгроме і расчляненні СССР[6]. Паводле слоў Ю. Туронка, мемарыял быў апрацаваны І. Ермачэнкам і падпісаны В. Захаркам[7]. Пра змест гэтага дакумента, які яшчэ не быў апублікаваны, хацелася б сказаць падрабязней.

Спасылаючыся на непазбежнасць новай вайны ў Еўропе, старшыня Рады БНР пісаў: «Предвидя неизбежность таких событий, в которых вынужден будет принять самое деятельное участие и белорусский народ, я, как главный представитель белорусского народа, уполномоченный для защиты его прав и интересов, считаю своим долгом обратиться еще накануне этих событий с покорнейшей просьбой о помощи к Вашему Превосходительству как выдающемуся государственному деятелю, так гениально разрушающему насилие Версаля»[8].

Далей В. Захарка прывёў шэраг гістарычных фактаў аб тым, як Германія падтрымлівала барацьбу беларусаў за нацыянальнае вызваленне і беларускую дзяржаўнасць, падкрэсліўшы, у прыватнасці, што Германія падчас акупацыі Заходняй Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны адразу дала беларусам нацыянальную школу, а ў 1919 г. яе ўрад аказаў гасцінны прытулак ураду БНР. У дакуменце змяшчаўся кароткі агляд барацьбы беларускага народа за нацыянальную дзяржаўнасць, пачынаючы ад Усебеларускага з'езда 1917 г., канстатавалася цяжкае становішча Беларусі, у якім яна апынулася пасля падзелаў у выніку дагавораў савецкай Расіі з Польшчай, Літвой і Латвіяй. В. Захарка паведаміў наступныя лічбы страт беларусаў у тэрыторыі і насельніцтве: па стану на пачатак 1939 г. з усёй тэрыторыі Беларусі плошчай 415 447 кв. км, на якой пражывала 16 909 300 чал.[**], Польшчай было захоплена 101 990 кв. км з насельніцтвам 4 458 700 чал., Літвой – адпаведна 5433 кв. км з насельніцтвам 231 тыс. чал., Латвіяй – 11 870 кв. км з насельніцтвам 494 тыс. чал. «Отведено Москвой под Белорусскую Советскую Республику» 113 115 кв. км з насельніцтвам 5 246 400 чал., заставалася ў адміністрацыйных межах РСФСР 183 039 кв. км з насельніцтвам 6 479 200 чал.[9]

У выніку, сцвярджаў старшыня Рады БНР, «если мы положим на территорию Белоруссии карты: Польши, Литвы, Латвии и Украины, то для самого белорусского народа останется от нее не больше половины». Аўтар мемарандума асуджаў захопніцкую, вялікадзяржаўную палітыку Расіі і Польшчы ў дачыненні да Беларусі, негатыўна выказваўся пра заходнія дзяржавы як «дыктатараў Версаля» і, бачачы ў А. Гітлеры цвёрдага абаронцу зняважаных і абражаных народаў, звяртаўся да яго з просьбай: «Покорнейше прошу Ваше Превосходительство взять под Вашу высокую защиту и белорусский народ и поддержать при этом его право на самостоятельное государственное существование»[10].

Апрача гэтага варыянта мемарандума, які знаходзіцца ў фондзе І. Ермачэнкі Дзяржаўнага архіва Расійскай Федэрацыі, аўтарам выяўлены ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь пашыраны варыянт гэтага дакумента, дзе больш акцэнт робіцца на гісторыі барацьбы беларускага народа за сваю

[*] В. Захарка таксама дае іншую дату падачы мемарандума нямецкаму паслу ў Празе А. Генке – 19 красавіка 1939 г.

[**] Звяртаюць на сябе ўвагу значна перабольшаныя лічбы плошчы і насельніцтва Беларусі, якімі карыстаўся В. Захарка ў гэтым і іншых дакументах таго часу.

незалежнасць. У яго апошнім раздзеле «Меры к национально-государственному освобождению» выказваецца спадзяванне на дапамогу 16-мільённаму беларускаму народу з боку Германскай імперыі і яе фюрэра. А сам дакумент заканчваецца словамі: «При согласии же со стороны Вашего Превосходительства признать право белорусского народа на независимое национально-государственное существование я покорнейше прошу Ваше Превосходительство, когда наступит время, поддержать это право как силой Вашего гениального авторитета, так и силой возвышенной вами Великой Германской Империи»[11].

Пра абставіны і наступныя падзеі, звязаныя з падачай і далейшым лёсам мемарандума, В. Захарка паведамляе ў сваім памерам каля ста машынапісных старонак «Дакладзе па гісторыі Беларусі», закончаным у 1942 г., які ў машынапісным варыянце захоўваецца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь[12]. Паводле яго слоў, ён разам з І. Ермачэнкам перадаў мемарандум паслу Германіі ў Празе А. Генке, а апошні перадаў гэты дакумент асабіста А. Гітлеру.

2 жніўня 1939 г. нямецкаму паслу ў дадатак да мемарандума быў перададзены названы даклад В. Захаркі, «якім угрунтоўваліся на падставе гістарычных матарыялаў і геаграфічных дадзеных правы пакрыўджанага беларускага народу на сваё незалежнае ад чырвонай Масквы і панскай Польшчы існаваньне, на вольнае адраджэньне сваёй багатай нацыянальнай культуры». Мемарандум быў пададзены А. Генке на нямецкай і чэшскай мовах, прытым чэшскі экзэмпляр быў арыгіналам. Да яго прыкладаўся інфармацыйны даклад у перакладзе на нямецкую мову, які І. Ермачэнка перадаў палітычнаму рэферэнту Чэхіі і Маравіі ў Празе Колю. Апошні гэтых дакументаў беларусам не вярнуў[13].

Мемарандум і даклад былі адразу накіраваны нямецкім паслом у Берлін. На наступны дзень, 3 жніўня, В. Захарка і І. Ермачэнка тэлеграфам былі выкліканы ў Берлін у Міністэрства замежных спраў для больш шырокай інфармацыі па беларускаму пытанню. Беларускую дэлегацыю прыняў кіраўнік аддзела Міністэрства замежных спраў Германіі легацыйны саветнік М. Гайдэнгаген. Гутарка цягнулася некалькі гадзін 4 і 5 жніўня 1939 г. Як адзначаў В. Захарка, «прадстаўнік Нямецкага ўраду даў гарачыя запэўненьні, што нямецкі народ не забудзе на беларускі народ, які праз вякі ня толькі сваёй слаўнай мінуўшчыны, але і горкай нядолі і няволі прынёс у чысьціні свой антрапалёгічны тып, сваю самабытную культуру, свой дух да змаганьня за лепшую долю. Ён упэўніў, што немцы возьмуць на ўвагу, калі кола гісторыі так павернецца, дамаганьні беларускага народу і дадуць яму ўсе магчымасьці самастойнага культурнага існаваньня»[14].

Падчас сустрэчы з легацыйным саветнікам М. Гайдэнгагенам беларускія прадстаўнікі паставілі таксама пытанне пра стварэнне Беларускага цэнтра за межамі, які б гуртаваў вакол сябе ўсе беларускія эміграцкія арганізацыі. У сувязі з гэтым была пададзена пісьмовая запіска, у якой выкладаліся погляды пражскіх беларусаў на тагачаснае становішча беларускага народа і выказвалася ўпэўненасць, што нямецкі ўрад справядліва вырашыць пытанні, звязаныя з адраджэннем беларускага народа і дасць магчымасць арганізаваць беларускія цэнтры ў Празе, Берліне і Варшаве.

Усё падарожжа В. Захаркі і І. Ермачэнкі ў Берлін працягвалася з 2 па 9 жніўня 1939 г. і адбывалася на аўтамашыне І. Ермачэнкі. 10 жніўня В. Захарка і І. Ермачэнка прадставілі ў Празе фінансавую справаздачу аб ім на суму 2751 чэхаславацкая крона[15]. Вынікам гэтай паездкі было стварэнне ў канцы 1939 г. пры Міністэрстве ўнутраных спраў Германіі Беларускага прадстаўніцтва ў Берліне[16].

Ю. Туронак таксама дае інфармацыю пра гэту падзею. Ён піша, што беларускі мемарандум не быў праігнараваны. Беларускіх дзеячаў запрасілі 3 жніўня 1939 г. на канферэнцыю ў Міністэрства замежных спраў Германіі ў Берлін, дзе іх запэўнілі, што Германія супраць канцэпцыі «адзінай і непадзельнай Расіі». На гэтай канферэнцыі І. Ермачэнка і В. Захарка прадставілі праграму беларуска-нямецкага супрацоўніцтва[17].

У час знаходжання ў Берліне на кватэры беларускага дзеяча А. Шкуцькі адбылася нарада з удзелам В. Захаркі, І. Ермачэнкі, А. Шкуцькі і Ф. Акінчыца. Апошні праінфармаваў аб сітуацыі ў Заходняй Беларусі і настроях беларускага сялянства, якое, па яго словах, «чакае вайны, у якой бачыць сваё вырataваньне ад няпрошаных “дабрадзеяў” камуністых і жыдоў, што вызвалілі, як вобразна яны кажуць, іх ад сала, масла, солі, крамніны і г. д.». Ф. Акінчыц адзначыў адсутнасць палітычнай арганізацыі, якая б накі-

роўвала антысавецкія і антысеміцкія настроі сялянства ў патрэбнае рэчышча. Беларускія хрысціянскія дэмакраты апазіцыйна ставіліся да прылучэння да народнага фронту, а яго нацыянал-сацыялістычная партыя Беларусі яшчэ слаба разгарнула сваю працу. Удзельнікі нарады выказаліся за аб'яднанне ўсіх беларускіх актыўных сіл вакол Беларускага нацыянальнага цэнтра за межамі[18].

У той час як пераважная большасць беларускіх колаў спадзявалася на падтрымку Трэцяга рэйха ў справе беларускай дзяржаўнасці, група Я. Станкевіча і В. Іваноўскага арыентавалася на заходніх саюзнікаў, лічачы іх галоўнай сілай пры арганізацыі пасляваеннага ладу ў Еўропе. Асаблівыя надзеі яны звязвалі з адроджанай Польшчай, з дапамогай якой разлічвалі вывесці беларускае пытанне на міжнародны форум на базе федэратыўнай канцэпцыі. Але ў тагачасных умовах фашысцкага дамінавання ў Еўропе арыентацыя на Германію сярод беларускіх груп пераважала і выглядала больш рэалістычна[19].

20 лютага 1940 г. В. Захарка прадставіў германскаму ўраду дакладную запіску аб арганізацыі беларускай эміграцыі ў Еўропе[20]. У гэтым дакуменце зноў выказваліся спадзяванні на дапамогу «историческому двадцатимиллионному белорусскому народу, который так долго и тяжело страдает в невыносимом рабстве, созданном для его соседями Белоруссии»[21]. Пры гэтым меліся на ўвазе «векавыя ворагі беларускага народа» – Расія і Польшча, нянавісцю да правячых колаў якіх быў прасякнуты ўвесь дакумент. Аўтар гаварыў аб радасных пачуццях, якія выклікаў у беларускіх дзеячаў і нацыянальна свядомых мас разгром Германіяй польскай дзяржавы, і адначасова канстатаваў іх горыч у сувязі з захопам Заходняй Беларусі савецкай Расіяй, што было не меншым злом у параўнанні з польскім прыгнётам. Ён далей развіваў тэзіс аб несумяшчальнасці інтарэсаў Беларусі і Расіі і казаў аб шматлікіх гістарычных бедах і крыўдах, якія прынеслі беларусам маскавіты-велікаросы. Звяртаўся з просьбай да Германіі аказаць уплыў на Маскву, каб тая, папершае, абяссіліла б польскія пазіцыі ў Беларусі, а па-другое, адмовілася б ад русіфікацыі і прадставіла беларусам права на нацыянальна-культурнае развіццё[22]. Звяртаючыся далей да адносін беларускай эміграцыі з урадам Чэхаславакіі, В. Захарка сцвярджаў, што беларусы не атрымалі ад яго ніводнага талера, у той час як урад Чэхаславакіі штогод адпускаў для патрэб рускай і ўкраінскай эміграцыі шматмільённыя сродкі*.

Другая частка запіскі была прысвечана пытанню аб арганізацыі беларускай нацыянальна-культурнай працы ў межах Германскай імперыі, галоўнымі цэнтрамі якой павінны былі стаць Прага, Берлін і Варшава. Прага разглядалася як цэнтр усёй беларускай нацыянальна-культурнай работы за мяжой. Яна вялася тут таварыствам «Беларуская Рада ў Празе» (мелася на ўвазе Рада БНР), якое было зарэгістравана Міністэрствам унутраных спраў Чэхаславакіі ў 1924 г. Што датычылася Германіі, то тут пасля германа-польскай вайны аказалася не менш чым 30 тыс. беларусаў, трапіўшых у палон як воіны польскай арміі. Неабходна было правесці іх рэгістрацыю, сканцэнтраваць разам у адных і тых жа лагерах, забяспечыць найлепшыя ўмовы для выдання ў Берліне газеты «Раніца», якая публікавалася тут раней, і пашырыць склад Беларускага прадстаўніцтва ў Берліне (фартраўштэле). У Варшаве прапаноўвалася стварыць кіруючы орган для перарэгістрацыі і арганізацыі беларусаў у Польшчы, дазволіць ім праводзіць нацыянальныя сходы, мець свой друкаваны орган і прадставіць у распараджэнне беларусаў радыёстанцыю, якая б магла працаваць як на беларускай, так і на польскай мовах. Для ўсіх трох цэнтраў беларускай дзейнасці патрэбны былі адпаведныя памяшканні і абсталяванне, аб чым таксама ставілася пытанне[23].

На чале беларускай нацыянальна-культурнай працы ў Празе, Берліне і Варшаве павінна была стаць, па словах В. Захаркі, кампетэнтная ў беларускім нацыянальным руху асоба з моцнай воляй, арганізацыйнымі здольнасцямі, непадкупнай чэснасцю і адданасцю беларускаму народу, кандыдатура якой была б прапанавана беларусамі Прагі ў паразуменні з беларусамі Літвы і Латвіі. Падкрэслівалася, што гэтым чалавекам не павінен быць «глава всего белорусского национально-государственного движения, который несет главную ответственность за все

* Зусім па-іншаму В. Захарка ацэньваў адносіны ўрада Чэхаславакіі да беларусаў у сваім больш познім рукапісе па гісторыі Беларусі, дзе падкрэсліваў «спрыяльныя адносіны Чэскага ўраду да беларусоў», яго гасціннасць да прэзідэнта БНР П. Крэчаўскага і яго заступніка В. Захаркі (НАРБ. Ф. 908. Воп. 1. Спр. 2. Л. 74–75).

белорусское национальное дело и представительство которого может понадобиться в будущем для более важных и ответственных дел»[24]. Такім чынам, старшыня Рады БНР В. Захарка свядома выкрэсліваў сваю кандыдатуру на кіраўніцтва беларускай дзейнасцю ў Еўропе, пакідаючы для сябе магчымасць узначаліць беларускі ўрад пасля заняцця немцамі Беларусі. Верагодна, на пасаду кіраўніка беларускага руху ў Празе, Берліне і Варшаве аўтар запіскі хацеў бы хутчэй за ўсё вылучыць І. Ермачэнку.

У заключэнні запіскі выказвалася пазіцыя «национально-мыслящих белорусов к Советско-большевистской власти на Белоруссии». Яна заключалася ў непрыняцці і асуджэнні рэжыму бальшавіцкага насілля над беларускім народам. Характэрны апошні сказ паслання: «Однако, принимая во внимание нынешние взаимоотношения Германии с СССР, мы до перемены этих взаимоотношений будем всемерно воздерживаться от таких выступлений против СССР, которые могли бы повредить как интересам Германии, так и интересам дела, изложенного в настоящей записке»[25].

Хацелася б звярнуць увагу на тое, што старшыня Рады БНР у лютым 1940 г. прадбачыў перамену да горшага ва ўзаемаадносінах паміж Германіяй і СССР, чаму ён і займаў пазіцыю чакання, пакуль сітуацыя не зменіцца. Афіцыйная пазіцыя Берліна пасля падпісання пакта аб ненападзе паміж СССР і Германіяй заключалася ў тым, каб не даваць Маскве ніякіх падстаў для абвінавачвання нямецкіх улад у антысавецкай прапагандзе. 25 жніўня 1939 г., гэта значыць літаральна праз два дні пасля заключэння пакта, усе пасты нямецкай паліцыі атрымалі дырэктыву начальніка гестапа, якая забараняла існуючым у Германіі расійскім, украінскім, казацкім і каўказскім эмігранцкім арганізацыям і іх сябрам выказваць вусна ці пісьмова варожае стаўленне да СССР, ладзіць публічныя мерапрыемствы, выкарыстоўваць нацыянальныя сцягі і адзнакі. У дырэктывах не згадваліся беларускія арганізацыі, якія тады яшчэ не існавалі на тэрыторыі Германіі[26].

У снежні 1940 г. В. Захарка накіраваў нямецкаму ўраду яшчэ адзін дакумент – праект стварэння ў Германіі Беларускага нацыянальнага цэнтра за мяжой[27], дзе адлюстроўваліся пазіцыі беларускай палітычнай эміграцыі, накіраваныя на супрацоўніцтва з нацысцкай Германіяй, з дапамогай якой беларускія нацыянальныя дзеячы спадзяваліся стварыць уласную дзяржаву. У дакуменце адзначалася, што ў Германіі пасля вайны з Польшчай аказалася найбольшая колькасць беларусаў, якія знаходзяцца ў становішчы эмігрантаў. Па недакладных дадзеных, гэтая лічба дасягала 45 тыс. чалавек. Беларускія арганізацыі ўзніклі ў Празе, Берліне, Варшаве, Кракаве, Мюнхене, Ліцманштаце, Бяла-Падляскай, Страсбургу, Торне і іншых гарадах Германіі і далучаных да яе тэрыторый. Колькасць беларускіх арганізацый павінна была ўзрасці пасля вызвалення беларускіх ваеннапалонных з лагераў[28]. Вышэйадзначанае выклікала неабходнасць стварэння Галоўнага беларускага нацыянальнага цэнтра за мяжой пад кіраўніцтвам В. Захаркі, які б заставаўся на гэтай пасадзе «лицом несменяемым»*. Цікава, што ў параўнанні з папярэднім дакументам ад 20 лютага 1940 г. у снежаньскім ужо гаварылася аб стварэнні беларускага цэнтра іменна пад кіраўніцтвам В. Захаркі, прытым падкрэслівалася, што ён павінен быць нязменнай асобай на гэтай пасадзе.

У склад Цэнтра ўваходзілі б 15–20 беларускіх нацыянальных дзеячаў, што пражываюць за мяжой, якія запрашаліся ў гэты орган персанальна старшынёй Цэнтра. У дакуменце выкладаліся прынцыпы, паўнамоцтвы, кірункі дзейнасці Цэнтра, пытанні перадачы абавязкаў яго старшыні іншай асобе, выбараў новага старшыні Цэнтра. Гэтыя выбары, дарэчы, павінны былі арганізоўваць старшыні ці ўпаўнаважаныя галоўных беларускіх арганізацый у Варшаве, Берліне, Празе і Парыжы. Змест дакумента сведчыў, што старшыня валодаў практычна дыктатарскімі паўнамоцтвамі, а парадак перадачы яго абавязкаў іншай асобе і выбараў новага старшыні Цэнтра быў вельмі складаны. Пункт 5, дзе гаварылася аб прынцыпах, на якіх павінен быў будавацца цэнтр, гучаў так: «В Главный Белорусский Национальный Центр за границею могут поступать все вопросы национальной жизни, интересов и деятельности белорусов за границею, но рассмотрению и обсуждению Центра подлежат только те из них, которые будут предложены на такое рассмотрение и обсуждение мною как Председателем Центра»[29]. Пункт 9 рэгуляваў пытанне перадачы звання і абавязкаў

* У дакуменце пункт аб нязменнасці старшыні Цэнтра выкраслены.

старшыні Цэнтра наступным чынам: «Передача звания и обязанностей Председателя Главнаго Белорусскаго Национальнаго Центра другому лицу может произойти не иначе как только с моего согласия и по моему выбору, оформленному в письменном порядке»[30]. У заключэнні запіскі выказвалася надзея, што дзейнасць Галоўнага беларускага нацыянальнага цэнтра за мяжой не сустрэне перашкод з боку германскага ўрада, у сувязі з чым В. Захарка намерваўся пачаць рассылку праекта Статута гэтага цэнтра беларускім нацыянальным дзеячам за мяжой, што азначала пачатак яго дзейнасці[31].

Як пісаў пазней В. Захарка у сваім рукапісе па гісторыі Беларусі, «урад Нямеччыны спрыяльна паставіўся да арганізацыі Беларускага Цэнтру, аднак хвароба аднаго з асноўных ініцыятараў гэтай ідэі сп. Захаркі, а таксама некаторыя ўнутраныя разнагалосьсі ў справе кіраўніка Цэнтру не далі магчымасьці ажыцьцявіцца гэтай ідэі»[32].

У перыяд з 13 па 27 лютага 1941 г. І. Ермачэнка і В. Захарка зрабілі паездку ў Берлін, Познань, Варшаву, Ліцманштат і Кракаў. У час падарожжа яны асабіста азнаёміліся з беларускімі арганізацыямі і завязалі кантакты з іх актывістамі, з боку якіх сустрэлі падтрымку ідэі стварэння Беларускага цэнтра за межамі. 23 красавіка 1941 г. на арганізацыйным сходзе беларусаў Пратэктарата Чэхіі і Маравіі быў створаны Камітэт беларускай самапомачы ў Празе на чале з І. Ермачэнкам[33].

У дзень пачатку вайны Германіі з Савецкім Саюзам у Празе было склікана тэрміновае пасяджэнне Камітэта беларускай самапомачы, дзе І. Ермачэнка выказваў упэўненасць у перамозе нямецкай зброі. Беларусы Прагі звярнуліся да В. Захаркі, каб ён выступіў з адозвай да беларускага народа, у якой бы «прызваў беларускі народ да змаганьня супроць бальшавікоў і растлумачыў бы яму, што нямецкі меч нясе яму не няволю, а вольнае жыцьцё на сваёй зямлі ў цеснай дружбе з нямецкім народам»[34].

27 чэрвеня 1941 г. на агульным сходзе беларусаў у Празе, якія пражывалі ў Пратэктараце Чэхіі і Маравіі, была прынята рэзалюцыя аб падтрымцы гітлераўскай агрэсіі супраць Савецкага Саюза. На сходзе прысутнічала невялікая група беларусаў, што пражывалі ў Празе і ўваходзілі ў склад Камітэта беларускай самапомачы. На ім быў абмеркаваны даклад І. Ермачэнкі аб сучаснай сітуацыі ў беларускай эміграцыі і прынята рашэнне аб ахвяраваннях для нямецкага Чырвонага Крыжа. У прыватнасці, у рэзалюцыі выказвалася гатоўнасць аказаць грашовую ахвяру ў размеры не менш аднадзённага заробку кожнага беларуса, што пражываў у Пратэктараце, на карысць нямецкай арміі. Сход прыняў рашэнне накіраваць прывітальную тэлеграму А. Гітлеру з пажаданнямі перамогі «нямецкага і нашага ворага – камуністычна-жыдоўскага рэжыму на Усходзе Эўропы, а гэтым самым поўнага асвабаджэння Беларускага і іншых народаў ад камуністычнае і жыдоўска-бальшавіцкае заразы»[35]. Як успаміналa ўдзельніца сходу Ларыса Геніюш, тэлеграма А. Гітлеру была прынята па ініцыятыве і пад націскам І. Ермачэнкі. Іван Геніюш як старшыня сходу быў вымушаны падпісаць яе. Астатнія ўдзельнікі сходу, паводле Л. Геніюш, свае подпісы не паставілі[36].

Старшыня Рады БНР В. Захарка звярнуўся з адозвай да беларускага народа, у якой заклікаў: «Заставайцеся на месцы, арганізуйцеся ў нацыянальныя гурткі і саюзы і дапамагайце, чым можаце, спрыяючай беларускаму нацыянальна-дзяржаўнаму адраджэньню Нямецкай арміі»[37]. Тэкст адозвы быў перасланы ў Берлін.

Выбар прагерманскай арыентацыі беларускіх палітычных дзеячаў у Празе напярэдадні і ў пачатку Другой сусветнай вайны тлумачыўся перш за ўсё перамогамі нямецкай зброі ў еўрапейскіх ваенных кампаніях. А. Гітлер і яго нацысцкі «новы парадак» бачыліся эмігранцкім беларускім палітыкам лепшымі для беларусаў, чым сталінскі Савецкі Саюз з яго палітыкай рэпрэсій ці Польшча з яе асіміляцыйнай палітыкай адносна нацыянальных меншасцей. Да таго ж Германія адкрыта ці тайна змагалася з гэтымі двума «векавымі ворагамі» Беларусі, што прыбаўляла да яе сімпатый з боку пакрыўджаных Масквой і Варшавай народаў. Прагерманскія настроі жывіліся і добрымі адносінамі да беларусаў з боку германскіх ваенных і палітычных улад у гады Першай сусветнай вайны і пасля яе заканчэння, аб чым з удзячнасцю ўспаміналі беларускія дзеячы ў сваіх пасланнях да нацысцкага ўрада. Стаўка на А. Гітлера, які перакройваў палітычную карту Еўропы, спараджала надзеі на аднаўленне беларускай дзяржаўнасці пад фашысцкай свастыкай. Зразумела, што арыентацыя на Берлін была выклікана і амбі-

цыйнымі планамі некаторых беларускіх эміграцкіх дзеячаў, перш за ўсё І. Ермачэнкі.

Пасланні старшыні Рады БНР В. Захаркі А. Гітлеру (красавік 1939 г.) і нямецкаму ўраду (люты і снежань 1940 г.) адлюстроўвалі як надзеі пранямецкі настроеных эміграцкіх колаў на тое, што беларускае пытанне будзе ўзята пад увагу ў запланаваных Берлінам ваенных кампаніях на ўсходзе Еўропы, так і чаканні канкрэтнай нямецкай падтрымкі ў арганізацыі беларускай эміграцыі. Нязначныя крокі немецкіх улад у рэалізацыі прапаноў, вылучаных В. Захаркам у запісках 1940 г., сведчылі пра тое, што Берлін быў даволі скептычна настроены адносна выканання пажаданняў эмігрантаў з СССР. Гэта пацвярджаецца дакументамі Міністэрства замежных спраў Германіі, выдадзенымі 26 жніўня і 1 снежня 1941 г.[38] Дарэчы, нічога невядома як аб рэакцыі А. Гітлера на мемарандум В. Захаркі, так і аб адносінах берлінскага ўрада да яго запісак, накіраваных у 1940 г. Гэта пытанне патрабуе далейшых даследаванняў. Трэба ўлічваць і тую акалічнасць, што вернападданніцкія выказванні старшыні Рады БНР В. Захаркі адносна фюрэра, як і яго адозвы да беларускага народа ў сувязі з пачаткам вайны Германіі супраць СССР, былі ініцыяваны І. Ермачэнкам, пад уплывам якога знаходзіўся В. Захарка.

[1] Гл.: Туронак Ю. Беларусь пад нямецкай акупацыяй. Мн., 1993. С. 32.

[2] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 908. Воп. 1. Спр. 2. Л. 74а.

[3] Там жа. Л. 75–76.

[4] Там жа. Л. 2–9.

[5] Там жа. Л. 76.

[6] Гл.: Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі (ДАРФ). Ф. 5875. Воп. 1. Спр. 21. Л. 26–35. Копія; Гл. таксама тэкст мемарандума на нямецкай мове з подпісам В. Захаркі (НАРБ. Ф. 908. Воп. 1. Спр. 2. Л. 36–40; Пашыраны варыянт дакумента на рускай мове на 17 маш. стар. – Ф. 908. Воп. 1. Спр. 2. Л. 41–57. Копія).

[7] Гл.: Туронак Ю. Указ. тв. С. 32.

[8] ДАРФ. Ф. 5875. Воп. 1. Спр. 21. Л. 27.

[9] Там жа. Л. 30.

[10] Там жа. Л. 35.

[11] НАРБ. Ф. 908. Воп. 1. Спр. 2. Л. 57.

[12] Там жа. Л. 57а–160.

[13] Там жа. Л. 10–12.

[14] Там жа. Л. 78.

[15] Там жа. Л. 19.

[16] Там жа. Л. 78.

[17] Гл.: Туронак Ю. Указ. тв. С. 32–33.

[18] Гл.: НАРБ. Ф. 908. Воп. 1. Спр. 2. Л. 78–79.

[19] Гл.: Туронак Ю. Указ. тв. С. 35–36.

[20] Гл.: НАРБ. Ф. 908. Воп. 1. Спр. 3. Л. 10–19. Копія; ДАРФ. Ф. 5875. Воп. 1. Спр. 21. Л. 81–88. Копія.

[21] НАРБ. Ф. 908. Воп. 1. Спр. 3. Л. 11.

[22] Там жа. Л. 12–13.

[23] Там жа. Л. 14–18.

[24] Там жа. Л. 18а.

[25] Там жа. Л. 19.

[26] Гл.: Туронак Ю. Беларуская кніга пад нямецкім кантролем (1939–1944) // Туронак Ю. Мадэрная гісторыя Беларусі. Вільня, 2006. С. 326.

[27] Гл.: НАРБ. Ф. 908. Воп. 1. Спр. 3. Л. 32–39; ДАРФ. Ф. 5875. Воп. 1. Спр. 21. Л. 110–114.

[28] Гл.: НАРБ. Ф. 908. Воп. 1. Спр. 3. Л. 33–34.

[29] Там жа. Л. 36.

[30] Там жа. Л. 37–38.

[31] Там жа. Л. 39.

[32] НАРБ. Ф. 908. Воп. 1. Спр. 2. Л. 81.

[33] Там жа. Л. 79–81.

[34] Там жа. Л. 82.

[35] Сачанка Б. Беларуская эміграцыя. 2-е выд., дап. і папраўл. Мн., 1991. С. 46–48; Знешняя палітыка Беларусі: Зборнік дакументаў і матэрыялаў. Т. 4 (чэрвень 1941 г. – жнівень 1945 г.). Мн., 2000. С. 18–19.

[36] Гл.: Геніюш Л. Споведзь. Мн., 1993. С. 43.

[37] НАРБ. Ф. 908. Воп. 1. Спр. 2. Л. 83.

[38] Гл.: Akten zur Deutschen Auswärtigen Politik. 1918–1945. Ser. D: 1937–1941. Bd. XIII.1. Die Kriegsjahre. Sechster Band, Erster Halbband: 23. Juni bis 14. September 1941. Göttingen, 1970. S. 248; Ibid. Sechster Band, Zweiter Halbband: 15. September bis 11. Dezember 1941. Göttingen, 1970. S. 740–741.

Паступіў у рэдакцыю 20.02.09.